УДК 94(476):331.108

# КАДРЫ І КААПЕРАТЫЎНЫ РУХ НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ НАПЯРЭДАДНІ АБВЯШЧЭННЯ ДЗЯРЖАЎНАГА СУВЕРЭНІТЭТУ БЕЛАРУСІ

*Пушкін Ігар Аляксандравіч*
дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін і фізічнай культуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій",
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)

*Прааналізаваны колькасны і якасны склад, станоўчыя і адмоўныя бакі развіцця кааператыўнага руху на Магілёўшчыне ў апошнія гады савецкай мадэрнізацыі (1988–1990 гг.). Свабода дзейнасці кааператываў прыцягнула масу прадпрымальных людзей, але кааператыўная дзейнасць так і не змагла ператварыцца ў буйны сектар народнай гаспадаркі, пры гэтым дазволіла многім кааператарам назапасіць стартавы капітал для стварэння ўласнага бізнесу.*

У час савецкай мадэрнізацыі быў назапашаны вопыт дзейнасці разнастайных кааператыўных арганізацый на тэрыторыі БССР [5; 8]. У другой палове 1950-х гг. была пачата палітыка выцяснення або замены кааперацыі дзяржаўнай гаспадаркай. Пасля прыняцця 14.04.1956 г. сумеснай пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР "Аб рэарганізацыі прамысловай кааперацыі" ўсе прамысловыя кааператывы і арцелі былі нацыяналізаваны. Кааператыўныя прадпрыемствы паступова абдзяржаўліваліся [7, с. 16]. Да пачатку эканамічных рэформ перыяду "перабудовы" кааператыўная форма гаспадарання была прадстаўлена сістэмай прамысловай, спажывецкай і жыллёва-будаўнічай кааперацыі. Яны знаходзіліся пад жорсткім кантролем і былі пазбаўлены магчымасці рэалізоўваць прынцыпы кааператыўнай дзейнасці ва ўзаемаадносінах з гаспадарчымі партнёрамі. Гэта не давала кааперацыі магчымасці нармальна развівацца і эфектыўна весці справу.

Распачатая ў ходзе "перабудовы" ў СССР эканамічная рэформа прадугледжвала развіццё прыватнага сектара. Ад савецкіх прадпрымальнікаў патрабавалася за кароткі тэрмін насыціць рынак дэфіцытнымі спажывецкімі таварамі і платнымі паслугамі; узмацніць канкурэнцыю паміж прадпрыемствамі розных форм уласнасці; стварыць дадатковыя працоўныя месцы. СМ СССР 5.02.1987 г. прыняў пастанову "Аб стварэнні кааператываў па вытворчасці тавараў народнага спажывання". Вярхоўны Савет СССР 26.05.1988 г. прыняў Закон "Аб кааперацыі ў СССР". Новы заканадаўчы акт разглядаў кааператывы нароўні з дзяржаўнымі прадпрыемствамі як частку адзінага народнагаспадарчага комплексу і садзейнічаў чалавечай актыўнасці, павышэнню творчасці і майстэрства людзей. Важным паказчыкам дзейнасці з'яўлялася нарошчванне аб'ёмаў прадукцыі і паслуг [4, арк. 753–775; 1, с. 551; 7, с. 179]. На 1.01.1990 г. у СССР было зарэгістравана 193 тыс. кааператываў, у іх было занята каля мільёна чалавек [6, с. 30–36].

У БССР на 1.08.1988 г. было 1 211 зарэгістраваных кааператываў, функцыянавалі 791 (65,3 %), дзе працавалі 8,4 тыс. чал. У Мінску дзейнічалі – 209, Магілёўскай вобласці – 110, Гомельскай – 98, Мінскай – 96, Брэсцкай – 95, Віцебскай – 92, Гродзенскай – 91 [7, с. 179]. Колькасць кааператываў і колькасць працуючых у іх стабільна павялічвалася. У пачатку 1990 г. было 5 346 дзеючых кааператываў, дзе працавалі 123 861 чал. У Мінску – 1433 кааператывы (77 053 працаўнікоў), Магілёўскай вобласці – 626 (11722), Гомельскай – 727 (20930), Мінскай – 724 (15225), Брэсцкай – 504 (8664), Віцебскай – 822 (14184), Гродзенскай – 510 (9083) [3, арк. 10].

У Магілёўскай вобласці на 1.01.1990 г. было зарэгістравана 703 кааператывы, у тым ліку дзеючых – 626 (1.01.1989 г. – 280) [3, арк. 1]. У г. Магілёве працавала 296 кааператываў, г. Бабруйску – 147. Сярод раёнаў вобласці найбольшая колькасць была ў Бабруйскім (22), Магілёўскім (21), Клічаўскім і Шклоўскім (па 12). Па кірунках дзейнасці ў асноўным па бытавым абслугоўванні насельніцтва, будаўнічыя, мастацка-афарміцельскія, медыцынскія, па аказанні рамонтных паслуг насельніцтву і іншыя. Па вытворчасці тавараў народнага спажывання дзейнічала 73 кааператывы. Але іх доля ў агульным аб'ёме вытворчасці нехарчовых тавараў народнага спажывання была нязначнай – 0,9%. Сярод іх найбольш буйныя: "Кіравец" пры Магілёўскім аўтазаводзе імя С. Кірава (выраб запчастак для аўтамашын), "Элада" пры заводзе "Магілёўсельмаш" (выраб радыётэхнічных прылад для аўтамашын), "Элада" пры заводзе "Магілёўсельмаш" (вырабы з пластмасы) [3, арк. 2]. З агульнай колькасці дзеючых кааператываў 12,6% былі заняты бытавым абслугоўваннем насельніцтва. Нарыхтоўкай і перапрацоўкай другаснай сыравіны займаліся 14 кааператываў. Колькасць кааператываў грамадскага харчавання нават паменшылася з 15 у 1988 г. да 4 у 1989 г. Некаторыя з іх зачыніліся з-за недахопу сыравіны, завышэння коштаў на прадукцыю [3, арк. 3–4].

Развіццё кааператыўнага сектара побач са станоўчым (развіццё ініцыятывы, пашырэнне паслуг, забеспячэнне таварамі, новыя працоўныя месцы) прыводзіла і да ўзнікнення шэрагу негатыўных для эканомікі краіны з'яў. У адрозненне ад дзяржаўных арганізацый кааператывы мелі права выкарыстоўваць без абмежаванняў у разліках наяўныя грошы. Гэтым сталі актыўна карыстацца дзяржаўныя прадпрыемствы і ўстановы, якія пералічвалі кааператывам безнаяўныя грашовыя сродкі і праз іх куплялі дэфіцытную бытавую тэхніку, дываны, мэблю і іншыя тавары, якія карысталіся павышаным спажывецкім попытам, для наступнага перапродажу. Значную частку гэтых грошаў складалі сродкі фондаў развіцця вытворчасці, сацыяльнага развіцця дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацый, а таксама бюджэтныя асігнаванні [6, с. 31–35].

Праверкі фінансавых органаў засведчылі, што ў многіх кааператывах бухгалтарскі ўлік знаходзіўся ў нездавальняючым стане, гаспадарчыя і фінансавыя аперацыі не пацвярджаліся пярвічнымі дакументамі, не вяліся ведамасці руху сыравіны і матэрыялаў, уліковыя рэгістры. Усё гэта прыводзіла да самых розных парушэнняў і злоўжыванняў ("Верасень" Магілёў, "Уют" Бабруйск, "Манумент" Асіповічы). У шэрагу выпадкаў дзейнасць кааператываў не адпавядала іх статутам (кааператывы "Кантакт" і "Дыялог", створаныя пры Доме культуры ВА "Хімвалакно"). У некаторых кааператывах цэны на асобныя тавары былі значна вышэйшыя за дзяржаўныя цэны на аналагічныя тавары. Напрыклад, у Магілёўскай кааператыўнай краме "Патэнт" за 4 квартал 1989 г. кааператыўная цана была вышэйшая за дзяржаўную: на дэкаратыўныя вырабы – у 2,5 разы, на абутак – у 1,5, на трыкатажныя вырабы – у 1,6 (у тым ліку на спартыўныя касцюмы і шапкі з сінтэтычнай пражы – у 2, калготкі жаночыя з сінтэтычнай пражы – у 1,8), на швейныя вырабы – у 1,5 (у тым ліку на курткі з плашчавой тканіны – у 2,3) разы [3, арк. 6].

Кааператывы максімальна магчымую частку даходу накіроўвалі ў фонд аплаты працы і зусім нязначную на развіццё матэрыяльнай базы. Напрыклад, у Бабруйскім кааператыве "Механізацыя" было выплачана работнікам 92,4% даходу, адлічана яго ў фонд развіцця 5,8%, кааператыве "0-Т" пры Магілёўскім абласным упраўленні па будаўніцтве і архітэктуры, адпаведна, 90,8 і 4,9%, "Імпульс" пры заводзе "Тэхнапрыбор" – 88,6% і 5,0% [3, арк. 5].

Свабода дзейнасці кааператываў прыцягнула масу прадпрымальных людзей. Заробкі, якія атрымлівалі члены кааператываў, былі значна вышэйшыя ў параўнанні з дзяржаўным сектарам. Гэта аказвала істотны ўплыў на кадравы патэнцыял краіны. Частка высокакваліфікаваных спецыялістаў паступова пераходзіла на працу ў кааператывы. У параўнанні з 1988 г. у 1989 г. колькасць занятых у кааператывах узрасла ў 2,2 раза. Безумоўна, іх прываблівалі высокі заробак. Так, ён у кааператывах г. Бабруйска за 1989 г. павялічыўся амаль у 3 разы [3, арк. 64]. Сярэднямесячны заробак работнікаў кааператываў за 1989 г. склаў 492 руб. (для параўнання: у прамысловасці БССР на 1.01.1990 г. – 280,7 руб., у Магілёўскай вобласці – 277,6 руб.). Найбольш высокі ў кааператывах: "Пластык" пры ВА "Бабруйскфермаш" (выраб вырабаў з пластмасы, караляў) – 2 403 руб., "Кіравец" пры Магілёўскім аўтазаводзе імя С. Кірава (выраб запчастак для аўтамашын) – 2 130 руб., "Маяк" пры абласным аб'яднанні ЖКГ (рамонт аўтамабіляў) – 2 290 руб., "0-Т" – пры абласным упраўленні па будаўніцтве і архітэктуры (навукова-праектны) – 2 018 руб., "Імпульс-Т" пры Ленінскім райвыканкаме (будаўнічыя працы) – 1 675 руб., "Інтэграл" пры Магілёўскім аўтазаводзе імя С. Кірава (гандлёва-закупачны) – 1 494 руб.,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“Элада” пры заводзе “Магілёўсельмаш” (будаўнічыя працы) – 1 466 руб. [3, арк. 6].

Ва ўмовах дэфіцыту сыравіны многія кааператывы паразітавалі на дзяржаўнай уласнасці, часта не без заступніцтва афіцыйных асоб. У 1989 г. органамі пракуратуры і ўнутраных справаў Магілёўскага аблвыканкама праводзіліся расследаванні па шэрагу справаў, звязаных з буйнымі злоўжываннямі ў кааператыўнай сферы. Расла колькасць крадзяжоў, спекуляцый, хабараў. Выявілі 5 419 злачынстваў у эканамічнай сферы, па якіх канфіскавалі непрацоўных даходаў на суму больш як 1,8 млн руб., у здзяйсненні крадзяжоў, гаспадарчых і службовых злачынстваў выкрылі 1 450 чалавек, з іх 900 прыцягнулі да крымінальнай адказнасці [2, арк. 14].

У наступныя гады адбывалася згортванне кааперацыі. Гэтаму было шэраг прычынаў. Узмацненне жорсткасці падатковага заканадаўства. Для кааператываў былі паранейшаму забаронены асобныя сферы дзейнасці, для іх быў абмежаваны доступ да сыравіны, матэрыялаў і абсталявання. Найбольш буйныя кааператывы сталі шукаць новыя прававыя формы работы (напрыклад, сталі пераўтварацца ў акцыянерныя таварыствы). Кааператыўная дзейнасць да моманту распаду СССР так і не змагла ператварыцца ў буйны сектар народнай гаспадаркі, але дазволіла многім кааператарам назапасіць стартавы капітал для стварэння ўласнага бізнесу.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**


1. Гісторыя Беларусі : у 6 т. Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч і інш.; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.). – Мінск : Современная школа, Экоперспектива, 2011. – 728 с.
2. ДАГАМаг. – Ф. 9. Воп. 187. Спр. 148.
3. ДАМаг. – Ф. 812. Воп. 1. Спр. 4262.
4. ДАМаг. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3737.
5. Каляда, І. У. Дзейнасць кааператыўных арганізацый БССР у 1920-я гады / І. У. Каляда // Труды Бел. гос. технол. ун-та. Сер. 5. Пол., филос., ист., фил. – 2003. – Вып. XI. – С. 55–58.
6. Кирсанов, Р. Г. Развитие кооперативногно сектора в период перестройки и его роль в стабилизации потребительского рынка в СССР / Р. Г. Кирсанов // Вестн. Волгогр. гос. ун-та. Сер. 4, Ист. – 2014. – № 4 (28). – С. 30–36.
7. Пушкін, І. А. Кадравы патэнцыял прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў БССР (1944–1991) : манагр. / І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. – Магілёў : БДУТ, 2022. – 302 с.
8. Юрыс, С. Вытворчая дзейнасць спажывецкай кааперацыі БССР у 1945–1950 гг. / С. Юрыс // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XX стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы : матэр. рэспуб. нав. канф., Гомель, 13–14.10.2011 г. / рэдкал.: В. А. Міхедзька (гал. рэд.) і інш. – Гомель, 2011. – С. 252–256.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова